# МУЗЫКА

## Пытанні нацыянальнага і ўніверсальнага ў люстэрку беларускай музыкі і музычнай крытыкі 20-х гг. XX ст.

**Адраджэнне нацыянальнай мастацкай культуры Беларусі 1920-х гг. стымулявала інтэнсіўнае развіццё музычна-эстэтычных уяўленняў пра суадносіны нацыянальнага і ўніверсальнага ў працэсе станаўлення нацыянальнай музычнай культуры. Мастацтва ў гэты час, як і палітычныя і эканамічныя адносіны, становіцца аб'ектам радыкальнага абнаўлення на аснове сацыялістычнага ідэалу, як яго тады разумелі. Мэты і задачы мастацкай творчасці, суадносіны мастацкай дзейнасці і другіх формаў грамадскай свядомасці, прырода і сутнасць музычнага мастацтва, нацыянальная музыка як фактар духоўнага адраджэння нацыі – усе гэтыя пытанні былі ў полі зроку музычна-эстэтычнай думкі, якая адлюстроўвала імклівы рост музычна – культурнага жыцця Беларусі першага паслярэвалюцыйнага дзесяцігоддзя.**

Абуджэнне нацыянальнай самасвядомасці беларусаў і дынамізацыя нацыянальна – культурных працэсаў рэзка пазначыліся, як вядома, ужо ў сярэдзіне XIX ст. Чарговая хваля беларускага нацыянальнага адраджэння, якая прыпала на 1905–1907 гг., спарадзіла сапраўдны ўзлёт грамадска-палітычнай і эстэтычнай думкі ў Беларусі. Адным з вынікаў гэтага было ўсведамленне нацыянальных задач і ў галіне літаратуры і мастацтва і, асабліва ў галіне музычнай культуры. Гэта важная заваёва беларускага адраджэння другой паловы XIX – пачатку XX ст. была ўспрынята і атрымала далейшае развіццё ў 20-я гг. XX стагоддзя. Нацыянальна-культурны рух 1920-х гг. стаў лагічным працягам працэсаў папярэдняга перыяду, звязаных з фарміраваннем і развіццём беларускай нацыі.

У параўнанні з папярэднім перыядам беларускае духоўнае адраджэнне 20-х гг. XX ст. было значна больш інтэнсіўным і багатым па форме і змесце, па характару дынамікі мастацкай культуры. Важнай асаблівасцю, якая характарызавала гэты працэсс, быў шырокі спектр з'яў мастацкага жыцця, прадстаўлены ў ім. Калі ў дакастрычніцкі перыяд толькі пераважна нацыянальная літаратура і часткова тэатр абуджалі грамадскую актыўнасць, то ў 1920-я гг., побач з імі, фактарам і крыніцай беларускага нацыянальна-культурнага адраджэння моцна выступілі нацыянальная музыка і музычны тэатр.

Музычнае мастацтва, як і мастацкая культура ў цэлым, вылучылася ў якасці важнага аспекту абнаўлення грамадства. Праблемы нацыянальна-культурнага будаўніцтва вырашаліся ў гэты перыяд як арганічная частка ўсяго комплексу праблем новай эканамічнай палітыкі. НЭП, пасля голаду і гвалту ваеннага камунізму забяспечваў эканамічную і палітычную стабільнасць, пазітыўнае развіццё краіны. Паступовая дэмакратызацыя грамадска–культурнага жыцця ў перыяд НЭП-у спрыяла ўмацаванню думкі аб прымаце культуры як асновы і мэты дзейнасці. У грамадскай свядомасці выспявала разуменне таго, што вырашэнне эканамічных і сацыяльна-палітычных задач немагчы-



Autor materiału jest założycielem i kierownikiem zespołu "Hramnicy", który działa przy Państwowym Uniwersytecie Kultury w Mińsku; w dniach 20-22 maja 2017 r. zespół wystąpił na "Prologu". Na zdjęciu Uładzimir Zianiewicz z członkami "Hramnic" w bielskim Parku Królowej Heleny; foto A. Hładyszczuka

ма „без усё больш актыўнага культурнага ўздыму краю, больш хуткага руху і культурнай рэвалюцыі" [25]. Рэалізацыя ідэі культурнай рэвалюцыі становіцца ў гэты час састаўной часткай дзяржаўнай палітыкі, а нацыянальна-культурныя працэсы 1920-х гг. знаходзяць падтрымку кіруючай партыі, якая на VII з'ездзе КП(б)Б абвесціла: – „прыгнечаная царызмам беларуская культура павінна адрадзіцца" [22].

Перыяд з 1917-1929 гг., у адпаведнасці з характарам і зместам грамадска-палітычных і нацыянальна-культурных працэсаў, якія адбываліся ў Беларусі ў гэты час, можна падзяліць на тры этапы.

На першым этапе — (1917 – 1923), звязаным з абвяшчаннем БНР, распачаўся працэс ажыццяўлення культурнай палітыкі на аснове рэальнай аптымізацыі нацыянальных адносінаў, які ў 20-я гады атрымаў назву „беларусізацыя". Беларусізацыя распачалася фактычна з моманту вызвалення краіны з-пад польскай акупацыі. Пачала здзяйсняцца палітыка сацыяльнай і духоўнай кампенсацыі раней прыгнечаных царызмам культур, у тым ліку беларускай. Яна была накіраваная на ўсталяванне гарманічных узаемаадносінаў паміж усімі нацыямі, народамі, нацыянальнымі мовамі, якія тут гістарычна суіснавалі.

На другім этапе — (1923 – 1927) — беларусізацыя і карэнізацыя (вылучэнне на кіруючыя пасады прадстаўнікоў карэннага насельніцтва) ажыццяўляліся ў якасці афіцыйнай палітыкі, як комплекс практычных мерапрыемстваў на падставе рашэнняў X (8-16 сакавіка 1921 г.) і XII (сакавік 1923 г.) з'ездаў РКП(б). Рэзалюцыя па нацыянальным пытанні на X з'ездзе распрацоўвалася ў кантэксце праблем новай эканамічнай палітыкі. Мастацкая культура ў гэты перыяд развівалася ў сацыяльна-палітычных умовах, якія забяспечвалі магчымасць вольнага, раўнапраўнага развіцця культур не толькі беларусаў, але і нацыянальных меньшасцей, якія насялялі Беларусь. Побач з беларусамі магчымасці для задавальнення нацыянальна-культурных патрэб атрымалі рускія, палякі, яўрэі, латышы. Паскоранае развіццё адукацыі, выдавецкая дзейнасць на нацыянальных мовах, арганізацыя і функцыянаванне нацыянальных тэатральных і музычных калектываў сведчылі пра імкненне да гарманічнага развіцця нацыянальных адносінаў у Беларусі. Усё гэта знайшло адлюстраванне і ў ходзе музычна-культурнага будаўніцтва ў Беларусі 1920-х гг. Паспяховае развіццё беларускай нацыянальнай музыкі ў гэты перыяд у вялікай ступені было абумоўлена разуменнем неабходнасці дынамічнага адзінства нацыянальна-спецыфічнай духоўнай асновы (нацыянальнай мовы і фальклору) і пазітыўнага міжнацыянальнага

ўзаемадзеяння, інтэнсіўнага творчага засваення іншанацыянальнага досведу .

Прынцыпова новы змест культурнага ўзаемадзеяння на аснове новай палітыкі ствараў беспрэцэдэнтную аснову для інтэграцыйных працэсаў у галіне музычнай культуры ў межах СССР. Палітра выразных сродкаў беларускай музыкі значна ўзбагачалася ў гэты час у выніку засваення і выкарыстання здабыткаў рускай кампазітарскай школы. Узаемнае ўзбагачэнне музычных культур рэспублік, якія аб'ядналіся ў СССР, дазволіла пашырыць межы нацыянальнага ў мастацтве не толькі шляхам механічнага запазычвання, павялічэння кола тэм і вобразаў музыкі, але дало магчымасць па-новаму зірнуць і на ўласны вопыт, узбагаціць яго перш за ўсё праз глыбокае спасціжэнне духоўных і эстэтычных каштоўнасцей уласнай традыцыйнай культуры. Складвалася новая грамадска-палітычная і маральна-псіхалагічная сітуацыя, якая дазваляла музычным крытыкам і публіцыстам зрабіць, можа, заўчасныя і рамантычна-ідэалізаваныя, але накіраваныя ў будучыню высновы пра тое, што „скарбы беларускай музычнай культуры становяцца ў цэнтры ўвагі іншых народаў".

Сфера іншакультурнага ўздзеяння на беларускую музыку значна пашыраецца ў гэты час у выніку яе далучэння да музычна-культурных здабыткаў заходнееўрапейскіх краін. У гэты перыяд былі зроблены актыўныя спробы ўваходжання беларускай музыкі ў агульнаеўрапейскі музычна-культурны працэс [32, 33].

У 1920-я гады пасля перыяду сусветнай вайны і рэвалюцыйнай нестабільнасці, у нацыянальны музычны побыт паступова вяртаюцца лепшыя дасягненні еўрапейскай музычнай культуры. Усё новае ў галіне кампазітарскага мыслення, тэхнікі кампазіцыі і музычнай мовы, што з'яўлялася ў творчай практыцы лепшых кампазітараў гэтага часу, станавілася фактам творчай свядомасці і ў Беларусі [16]. У выніку гэтага беларуская музыка таго часу ў лепшых сваіх праяўленнях сінтэзуе не толькі агульныя ідэйна-эстэтычныя прынцыпы новага мастацтва, але і ўключае ў нацыянальную практыку музычна-драматургічныя спосабы архітэктонікі, якія набылі агульнаеўрапейскае распаўсюджанне, засвойвае прыёмы ўвасаблення фальклорнага матэрыялу, якія атрымалі развіццё ў творчай практыцы еўрапейскіх і рускіх кампазітараў XIX — пачатку XX ст. Музычная крытыка і публіцыстыка ацэньвалі гэтую сітуацыю ў форме аптымістычнай заявы пра тое, што „беларуская музыка перажывае цяпер такі момант, калі яна выходзіць з Беларусі і становіцца агульна-культурнай каштоўнасцю, далучаецца да агульна-чалавечай музыкі" [29].

1920-я гг. – перыяд станаўлення музычнай культуры Беларусі менавіта як культуры нацыянальнай. Пастаноўка задачы беларусізацыі дала дадатковы імпульс развіццю ўсёй сістэмы нацыянальнай музычнай культуры: музычнай адукацыі, фарміраванню кадраў нацыянальных выкладчыкаў, канцэртна-выканальніцкай дзейнасці — ствараюцца новыя музычныя выканальніцкія калектывы, значна актывізуецца канцэртная дзейнасць; закладваюцца асновы нацыянальнай кампазітарскай школы. Усе гэтыя з'явы знаходзілі асэнсаванне і адлюстраванне на старонках беларускіх перыядычных выданняў у музычна-крытычных і музычна-публіцыстычных публікацыях [20, 21, 24 28, 31]. На хвалі нацыянальнага ўздыму распачынаюцца музычна-эс-

тэтычныя дыскусіі, у якіх у канцэптуальным плане абмяркоўваюцца праблемы гістарычнага развіцця нацыянальнай музыкі. У гэтых дыскусіях сталее музычна–эстэтычная свядомасць, актыўна выпрацоўваецца музычна – крытычны інструментар. Адлюстроўваючы кампазітарска–творчую і канцэртна – выканальніцкую практыку, што імкліва разгортвалася ў гэты час, беларускія музычныя крытыкі і публіцысты абагульнялі найбольш яркія, тыпалагічныя яе рысы, спасцігалі дыялектыку суадносінаў новага мастацтва і нацыянальнай культурнай традыцыі [1, 4, 7, 10-17]. Уключэнне ў сферу эстэтычнай ацэнкі з'яў музычнай культуры мела на мэце праграмаваць музычна-эстэтычную практыку, паказаць перспектывы і вектары руху да пастаўленых мэтаў.

Інтэнсіўная распрацоўка пытанняў нацыянальнага і ўніверсальнага ў мастацтве, і ў музыцы ў прыватнасці, стала цэнтральнай тэмай дыскусій па пытаннях літаратуры і мастацтва першай паловы 1920-х гг. На працягу амаль усіх 1920-х гг. працэс абмеркавання ідэй і тэорый, у дачыненні нацыянальнай музычнай культуры, меў даволі шырокі дэмакратычны і ў пэўнай ступені плюралістычны характар. Агульныя мэты, што дэкларараваліся, усведамленне гістарычнай неабходнасці надавалі гэтаму працэсу форму ўнутранага адзінства. Тым не меньш у гэтых дыскусіях былі свае ідэйныя дамінанты, некаторыя меркаванні не успрымаліся як канструктыўныя, былі таксама і ідэі, якія сустрэлі рэзка негатыўную рэакцыю музычна-культурнага грамадства. Погляды на тое, якім павінна быць нацыянальнае музычнае мастацтва Беларусі, якія шляхі вядуць да дасягнення нацыянальнага музычна-эстэтычнага ідэалу, самі ўяўленні пра гэты ідэал адлюстроўвалі часам папулярныя палітычныя, філасофскія, эстэтычныя і маральна-этычныя арыентацыі розных сацыяльных і нацыянальных груп насельніцтва Беларусі 20- х гг.

Дыскусіі выявілі, перш за ўсё, супярэчнасці паміж беларускімі адраджэнцамі, якія марылі пра стварэнне самабытнага музычнага мастацтва, нацыянальнай кампазітарскай школы, і ідэолагамі бальшавіцкай крытыкі, якія „спрасцілі ідэю класавасці мастацтва, імкнуліся пераўтварыць арыентаванае на агульначалавечыя і нацыянальныя каштоўнасці музычнае мастацтва ў школу „пралетарскага выхавання і ў трыбуну для пашырэння сацыялістычных ідэй у іх бальшавіцкай інтэрпрэтацыі". Як ідэалагічны кампраміс узнікла „сярэдняя", нацыянальна-камуністычная плынь, прыхільнікі якой імкнуліся спалучыць элементы беларускіх нацыянальных традыцый з пралетарскай, рэвалюцыйнай ідэалогіяй" [23].

У беларускім друку 1917 — 1920 гг. нацыянальна–дэмакратычнага і нацыянальна–асветніцкага кірункаў (газеты „Вольная Беларусь", „Беларускі шлях" і „Беларусь", часопіс „Беларуская жыццё" і інш.) развівалася думка, абгрунтаваная на пачатку стагоддзя ў газеце „Наша ніва": задача беларускага музычнага мастацтва — садзейнічаць развіццю беларускай дзяржаўнасці, сацыяльна-палітычнаму і духоўнаму адраджэнню народа, яго мовы і асветы.

Актывізацыя працэсаў адраджэння нацыянальнай культуры, станаўленне музычнага прафесіяналізму, узнікненне новых мастацкіх плыняў, што адбывалася ў 1921 – 1923 гг., выклікала абвастрэнне дыскусій па праблемах беларускай нацыянальнай прафесійнай музыкі. Абмеркаванні ў гэты перыяд актыўна вяліся на старонках газеты „Савецкая Беларусь". Распачаліся

яны артыкуламі „Аб беларускім хоры" і „Аб сучасным беларускім тэатры" А. Куксы [26,27]. Беларуская музычная культура, на яго думку, павінна развівацца „сапраўднай пуцявінай беларускага народнага мастацтва". Адстойваючы нацыянальны стыль музыкі, які ўвасабляецца, паводле слушных разважаннеў А.Куксы, як у знешней форме так і ва ўнутраным змесце музыкі, ён завастраў увагу на неабходнасці выкарыстоўвання беларускага народнага музычнага інструментарыю ў сучаснай выканальніцкай практыцы, заклікаў кампазітараў да стварэння пасапраўднаму нацыянальных форм беларускай прафесійнай музыкі. З гэтых жа пазіцый важную тэму адраджэння традыцыйных народных свят і абрадаў, якія будуць садзейнічаць станаўленню прафесійнага мастацтва ўздымаў Я. Святляк [34]. Праблемы нацыянальных стылю і рэпертуару былі ў цэнтры ўвагі У. Галубка [8] і З. Жылуновіча [19], якія заклікалі трымацца фальклорных першакрыніц у справе адраджэння беларускага мастацтва. Задачу грунтоўнай музычна-этнаграфічнай адукацыі дзеля выхавання нацыянальных кадраў кампазітараў і музыкантаў уздымаў Я. В. Прохараў [31].

З іншых пазіцый асвятлялі пытанне публіцысты Парнасец (псеўданім) [30] і Арцём Гізель [9]. Яны крытыкавалі этнаграфічны падыход да праблемы станаўлення нацыянальнага стылю мастацкай культуры як павярхоўны. У творчай практыцы, на думку гэтых аўтараў, галоўнае не знешнія прыкметы і праявы нацыянальнага, а мастацкі прафесіяналізм, а ў крытыцы — аб'ектыўнасць і бескарысслівасць. Палемісты таксама мелі рацыю, бо пралеткультаўскія заклікі выгнаць „дух прафесіяналізму", „што пярэчыць асноўным задачам" сучаснага мастацтва, актыўна распаўсюджваліся ў музычна-культурным асяроддзі ў гэты перыяд. Але ідэя засваення еўрапейскага і, асабліва, рускага музычнага прафесіяналізму, якую яны сцвярджалі, успрымаліся часткай творчай інтэлігенцыі ў якасці новай, прыхаванай і вытанчанай формы падаўлення нацыянальнай самасвядомасці.

Сбалансаваную пазіцыю ў пытаннях развіцця нацыянальнай музычнай культуры выказаў З. Бядуля. У шэрагу артыкулаў, прысвечаных праблемам нацыянальнага стылю беларускай музыкі, музычнай адукацыі, беларускаму музычнаму тэатру, балету, ён пазбег крайнасцяў, характэрных для некаторых выказванняў. Абагульняючы розныя пункты гледжання, З. Бядуля абгрунтаваў думку пра тое, што музыка павінна быць народнай па сваіх крыніцах, нацыянальнай па стылю і прафесіянальнай па мастацкаму ўзроўню [2,3, 5, 7]. Першым крокам да гэтага сінтэзу ён лічыў пастаўленую ў БДТ-1 Е. Міровічам драму М. Чарота „На купалле", (музыка У. Тэраўскага, харэаграфія К. Алексютовіча, сцэнаграфія К. Елісеява) У рэцэнзіі на прем'еру гэтага спектакля, якая адбылася 20 лістапада 1921 г., Янка Журба выказаў думку, што гэта музычная драма пачала „новую эпоху ў гісторыі развіцця беларускага тэатра", што яна „кладзе цвёрды грунт сапраўднай беларускай оперы ў навейшым духу, бо ў гэтай музыцы адбіліся адзнакі сучаснага кампазітарскага мастацтва" [18].

Супастаўленне розных пунктаў гледжання ў працэсе дыскусій першай паловы 1920-х гг. было змястоўным і карысным. Яно дазволіла ўзняць важныя для станаўлення беларускай музыкі праблемы, асэнсаваць вопыт культурна-

га ўзаемадзеяння ў гэтай галіне. Нягледзячы на тое, што ў ходзе абмеркаванняў выявіліся вульгарна-сацыялагічныя тэндэнцыі (ва ўмовах БССР моцна праяўляў сябе нарматыўны кірунак сацыяльна -класавай музычнай эстэтыкі: музычнае мастацтва інтэрпрэтавалася як „зброя класавага змагання", неабходная для прапаганды сацыялістычнага ладу жыцця і пралетарскай камуністычнай ідэалогіі, дыскусіі паклалі пачатак распрацоўцы канцэпцый развіцця беларускай музычнай культуры і мастацтва на аснове гарманічнага ўзаемадзеяння ўласна нацыянальнага культурнага субстрата (мовы і фальклору) і пазітыўных іншанацыянальных уплываў.

**Уладзімір Зяневіч**

*(г. Мінск)*


1. Балицкий А. Белорусская народная музыка. Известия. 23 апреля 1927 г. – С. 7.

2. Бядуля З. Беларуская народная мелодія. Вольны сцяг, 1921. № 6(8).

3. Бядуля З. Беларускія нацыянальныя танцы. Вольны сцяг, 1922. – № 1(9).

4. Бядуля З. Наша будучая кансерваторыя. Савецкая Беларусь, 1924, 11 кастрычніка.

5. Бядуля З. Стыль. Рунь, 1920. № 3.

6. Бядуля З. Тэатр і выхаваньне мас. // Полымя, 1922. № 1.

7. Бядуля Зм. Как создать белорусский балет. Советская Белоруссія, 1922. № 261.

8. Галубок У. Савецкая Беларусь,1922, 3 лютага.

9. Гізель Арцём. Яшчэ аб рэпертуары беларускага тэатру. Савецкая Беларусь, 1922, 29 студзеня.

10. Дрейзин Ю. Музыка в БССР. // Трибуна искусства, 1925. № 1. С. 4.

11. Дрейзин Ю. На оперных спектаклях. // Трибуна искусства, 1925. № 12, С.4-5.

12. Дрейзин Ю. Опера «Освобождение труда». – Соха і молот, 1924, 13 ноября.

13. Дрэйзін Ю. Кастрычнік і беларуская музыка. // Узвышша, 1927. № 5. С. 167-168.

14. Дрэйзін Ю. Кастрычнік і музыка. // Полымя, 1927. № 7. С. 171.

15. Дрэйзін Ю. Музыка і жыццё. Савецкая Беларусь, 1925, 17 лістапада.

16. Дрэйзін Ю. Новыя плыні ў сучаснай музыцы. Полымя, 1925. № 3. С. 23.

17. Дрэйзін Ю. Праблемы нацыянальнае музыкі. Маладняк, 1926. № 11. С.122.

18. Журба Я. Рэцэнзія на музычную драму М. Кудзелькі «На купаллі». Савецкая Беларусь, 1921, 9 снежня.

19. Жылуновіч З. Беларуская самабытнасць і безухільны інтэрнацыяналізм, ці старая прагудка на новы лад. Савецкая Беларусь, 1928, 20 лістапада.

20. Загв. І. Патрэбнасць заснавання беларускай оперы. Трибуна искусства, 1925. № 5. С. 5-6.

21. Масленнікава В.П. Музычная адукацыя ў Беларусі. – Мн.: Навука і тэхніка, 1980. – 112 с.

22. Компартия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов. Минск, 1973. — Т.1. — С. 95.

23. Конан Уладзімір. Тэатральныя дыскусіі. // Мастацтва, 1996. — № 1. — С. 26.

24. Крывіч Яўген. Патрэбнасць беларускай оперы. // Трибуна искусства, 1925. № 7. С. 5-6.

25. Крыніцкі А. Да пытання аб нацыянальнай культуры. Бальшавік Беларусі, 1927. №5. С. 15.

26. Кукса А. Аб сучасным беларускім тэатры. Савецкая Беларусь, 1921, 3 чэрвеня.

27. Кукса А. Аб сучасным беларускім тэатры. Савецкая Беларусь, 1921, 3 ліпеня.

28. Материалы Первой Всебелорусской конференции по музыкальному образованию. Звязда, 1925,

16 снежня.

29. Паведамленне аб выступленні беларускіх артыстаў на Міжнароднай выстаўцы ў г. Франкфурце-на-Майне.//Полымя, 1927, – № 7, – С. 267-268.

30. Парнасец, Савецкая Беларусь, 1921, 10 жніўня.

31. Прохоров Я. В. „О музыкально-этнографическом образовании". Доклад для преподавателей Белорусского государственного музыкального техникума и представителей Инбелкульта. 9 марта 1925 г. //Архіў літаратуры і мастацтва Беларусі. – Ф. 188. В. 1. Адз. Зах. 85.

32. Равенскі М. Гарманізаванне беларускіх народных песень маскоўскімі кампазітарамі. Узвышша, 1928.

№ 4, С. 153.

33. С.І. Достижения революционной музыки. Трибуна искусства, 1925. – № 10.

34. Святляк Янка. Аб святкаванні Купалля. Савецкая Беларусь, 1921, 1 чэрвеня.